УДК 93/94 (323)

# АПОШНІ КАРОЛЬ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ ПАДЧАС ГАРАДЗЕНСКАГА СЕЙМА 1793 ГОДА

***Наталля Васілюк***
*Гродна, Беларусь*

У артыкуле апісваецца дзейнасць апошняга караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага на сейме 1793 года, які адбываўся ў Гродна. Адзначаецца ягоная роля у дадзеным палітычным працэсе, яго пазіцыя адносна сейма, а таксама тое, якім чынам кароль успрыняў гэтую лёсавырашальную падзею для краіны.

***Ключавыя словы: кароль, падзел, Гродна, сейм***

Палітычную дзейнасць Станіслава Аўгуста Панятоўскага на сённяшні дзень гісторыкі ацэньваюць па-рознаму. Адны лічаць, што Панятоўскі з’яўляўся сапраўдным каралем, які да апошняга змагаўся за незалежнасць краіны. На погляд іншых, Станіслаў Аўгуст не хто іншы, як здраднік, які дапусціў падзел Рэчы Паспалітай, амаль нічога не зрабіўшы для яе захавання. Але кім Станіслаў Аўгуст быў на самай справе і чаго хацеў? Пастараемся даць адказ на гэтае пытанне шляхам аналізу ягонай дзейнасці падчас сейму 1793 года.

23 студзеня 1793 г. Расійская імперыя і Прусія падпісалі дамову аб падзеле Рэчы Паспалітай, асноўным апраўданнем якога было імкненне стрымаць распаўсюджанне«якабінскай заразы», якая, на думку абедзвюх краін, стала прычынай Вялікага сейма і Канстытуцыі 3 мая, узяўшай за аснову рэвалюцыйныя ідэі Францыі. Тым больш, Расійская імперыя абвінавачвала караля ў распаўсюджванні якабінства ў Варшаве

[2]. Мэтай гродзенскага сейму было афіцыйнае замацаванне дамовы аб другім падзеле Рэчы Паспалітай і і адмена усіх пастаноў Чатырохгадовага сейма.

Як прадбачлівы палітык Станіслаў Аўгуст Панятоўскі ведаў сапраўдныя мэты краін, якія збіраліся прымаць удзел у сейме, а іменна іх жаданне падзяліць тэрыторыю Рэчы Паспалітай паміж сабою. Ен разумеў, што правядзенне сейма і каралеўская прысутнасць на ім патрэбная толькі для ажыццяўлення гэтай мэты, нягледзячы на тое, што Расійская імперыя адмаўляла намеры падзелу. Падцверджаннем таго з'яўляецца дакумент "Сіверс і Гродзенскі сейм", у якім гаворыцца: "До конца марта в беседах с королем и его окружением посол заявлял, что ничего не знает о предстоявшем разделе и требует созыва сейма только для окончательного определения новой конституции Польши" [5].

Але, калі прааналізаваць іншыя дакументы Расіійскай імперый, можна ўбачыць, што намеры Кацярыны адправіць Панятоўскага ў Гродна і навязаць яму сваю пазіцыю былі занадта моцнымі. Ці не з'яўляецца гэта сведкам таго, што яна жадала не толькі для вызначэння новай канстытуцыі Польшчы, а дзеля чагосьці іншага, напрыклад, дзеля ажыццяўлення падзелу? У інструкцыі Сіверсу ад 22 снежня 1792 года гаворыцца: "Должны вы прежде всего советовать Королю Польскому ехать в Гродну и там соединиться с конфедерациею, и когда вы на то его склонить предуспеете, то следуйте за ним туда же немедленно "[11].

Также крайне нелестную характеристику дал Боскамп Станиславу Августу. Признавая его "ум, знание и любезность", он вместе с тем отметил "крайнюю слабость характера и убеждений короля", делавших его "жертвой влияний самых различных политических фракций". Подытоживая свой анализ, Боскамп рекомендовал Сиверсу опираться на короля, "скрывая, однако, от него нашу заинтересованность в нем" [12].

Некаторы час кароль працягваў пісаць жаласныя лісты імператрыцы і адмаўляўся ехаць у Гродна, але з часам вымушаны быў выехаць.

У дзенніках сейма можна знайсці ўніверсал, адрасаваны каралю, які сведчыць аб даце пачатку сейма [13].

Дык вось, у маі 1793 г. у Гродна пачала з'язджацца ўся Рэч Паспалітая. Іლавайскі апісвае гэтую сітуацыю [2].

Сейм праходзіў з 17 чэрвеня па 23 лістапада ў Новым замку. Першы перыяд працягваўся з 17 чэрвеня па 22 ліпеня, калі стаяла пытанне аб заключэнні трактату з Расіяй. З першага ж пасяджэння сойма пачаліся збоі. Ужо на трэці дзень Сіверс пайшоў на арышт шэрагу паслоў [1]. Ужо па гэтым можна сведчыць аб упэўненым, нават варожым для Панятоўскага настрої Кацярыны.

З першых жа дзен правядзення сейма Станіслаў Аўгуст Панятоўскі спрабаваў адстойваць сваю пазіцыю. На першым пасяджэнні ен ясна даў прысутным зразумець, што не збіраецца парушаць цэласнасць краіны. Расійская імперыя, у сваю чаргу, паставілася да такой заявы дастаткова жорстка, аб'явіўшы аб тым, што не пачне пагашэнне даўгоў караля да заканчэння сейма, аб чым сведчыць наступныя дакументы: [14], [5].

Вялікая частка прысутных жадала навязаць каралю сваю пазіцыю, спрабуючы даказаць, што яна з'яўляецца правільнай.

Бялінскі , напрыклад, трымаў прамову да караля, у якой намаляваў бездань, у якую трапіла Польшча ад дзейнасці рэвалюцыйнага сейма, таму цяперашні сейм мае абавязак выцягнуць яе адтуль [1].

Кароль жа не адыходзіў ад свайго пункту гледжання і моцна яго адстойваў. Наступным яго крокам стала далучэнне да Таргавіцкай канфедэрацыі пад умовай недатыкальнасці польскіх уладанняў.

Король Станислав-Август в речи своей 20 июня объявил сейму, что он приступил к Тарговицкой конфедерации под условием неприкосновенности польских владений, что он никоим образом не будет содействовать уступке польских провинций в надежде, что и сейм будет поступать точно так же. [5]

21 чэрвеня Бялінскі зачытаў ноты расійскага і прускага паслоў аб ратыфікацыі іх захопаў. Ноты былі аднолькавыя, што сведчыла аб згодзе дзьвух манархаў. Кароль адазваўся на гэта тым, што нагадаў аб сваім далучэнні да Таргавіцкай канфедэрацыі з умоваю захавання цэласці Рэчы Паспалітай.

Трынадцатага ліпеня дэлегацыя атрымала трактат аб падзеле з Расіяй [1], [7].

Другі перыяд працы Гродзенскага сейма пачаўся ўмоўна з 22 ліпеня і працягваўся да 25 верасня. Галоўным пытаннем быў трактат з Прусіяй [1].

Падчас гэтага перыяду Панятоўскаму прыйшлосы значна цяжэй. Кароль быў падвергнуты крытыцы з розных бакоў. Ен сам выступаў 10 жніўня, вытрымліваў пагрозы і абвінавачванні, цяжка пераживаў крыўдныя словы А. Карскага: "Хацеў бы мець столькі зямлі, колькі займе шляпа, і сканаць каралем" [8]. Кароль адказаў на гэта, што словы Антонія фальшывыя і прыдуманыя, бо ягоныя вусны яго ніколі не заплямілі [9]. Сейм патрабаваў судзіць Карскага за знявагу караля, але Станіслаў, як заўжды, прабачыў крыўдзіцеля. [8] Анквіч дапрашаўся суда караля і стагнаў на кінуты на яго паклеп, але потым адступіў [9].

Ужо па гэтаму можна судзіць аб тым, што на караля "накінуліся" амаль з усіх бакоў. А ен таксама чалавек і яму цяжка, вельмі цяжка было адбіваць гэтыя славесныя ўдары.

Станіслаў адмаўляўся ад сувязяў з "энтузіястамі" і "патрыетамі", аднак ен стараўся абараняць іх ад праследу Сіверса, а некаторых перапэўніваў і заклікаў да больш памяркоўнага выкарыстання іх патрыятычнага запалу. Ен дэманстратыўна пазбягаў удзелу ў шумлівых прыемах, гульнях і відовішчах, аднак павінен быў саступаць уціску ў момант раздачы ўзнагарод і пасад. Кароль стараўся дзейнічаць акуратна, памяркоўна, але з кожным днем гэта было ўсе цяжэй і цяжэй.

Гродзенскі сейм Панятоўскі характарызаваў як пекла і ягоныя паплечнікі падкрэслівалі, што кароль выглядаў вельмі дрэнна і на вачах старэў. Абцяжараны масай праблем у краіне, Станіслаў лічыў, што "нам у Польшчы нічога не застаецца, як толькі асветніцтва і адукацыя" [8].

У сваей прамове кароль выказаўся, што з'яўляецца законным і вольнаабраным манархам, бо маскоўскае войска ад месца выбару за 18 міль стаяла, а ен адзінадушна і вольна быў выкрыкнуты каралем, застаў край пад панаваннем сілы напрыканцы і падчас уступлення на трон [9].

Станіслаў засцерагаў народ, каб той быў асцярожны ў чыннасцях сваіх, пра што сведчаць тагачасныя ягоныя прамовы. Богам і сумленнем сведчыў, што ніякага граху супраць народа не выказаў. Далей ен працягваў, што зусім не мае зла ў сэрцы да тых, хто яго ачарняе, бо лічыць тое следствам патрыятызму. Ен спадзяецца, што ў далейшым не будзе злучаны на паўтарэнне тлуму з шанавання існуючага сейма як справядлівага. Прызваўшы ў сведкі бога, ен запэўніў, што гісторыя яго панавання павучае нашчадкаў у тым, што ен не прычыняўся да краевага няшчасця. Паслы валынскі і падляшскі апраўдвалі караля [9].

Аналізуючы дзеянні караля, можна зрабіць выснову, што гэта быў чалавек, які умеў, хацеў ісці і ішоў на кампрамісы. Проста ў тых умовах было вельмі цяжка дабіцца чагосьці добрага.

Трынаццатага жніўня падыйшла ратыфікацыя трактату з Расіяй. Заставалася яшчэ шмат паслоў, якія былі супраць яго [1].

16 жніўня кароль зваліў усе няшчасці краіны на прымус, які і сення сілаю да 150 тысяч салдат, у краі размешчаных, усялякі супраціў спыняе. На праціўныя сабе галасы Станіслаў адказаў, што не мае да іх антысімпатый, а тым больш помсты, на якую не адважваўся ўсе свае жыцце. Следам адзначыў, што мусіць тут прызнаць, што два разы заяўляў сумежным манархам аб сваей ахвоце зламыць польскую карону, калі з-за яго заняпад Польшчы прывязаны да валодання ею. Два разы заяўляў аб тым і два разы атрымаў адказ [9].

23-24 верасня адбылося знакамітае "нямое" паседжанне. У пачатку яго паслы патрабавалі выпусціць арыштаваных. Рачынскі прапанаваў "зачыніцца ў абсалютным маўчанні". Яго падрымаў кароль, сказаўшы, што там, дзе нельга гаварыць, выказваючы свае погляды, застаецца толькі маўчаць. Пры магільным маўчанні чытаецца праект трактату. Вось Бялінскі пытае пасолаў: "Ці згодныя ?". Некаторыя з патрыётаў прамармыталі, што не згодныя. Маршалак сейма прыступіў да галасавання: "Ці згаджаецеся, каб дэлегацыя падпісала праект ?". У адказ - маўчанне. Тады Бялінскі сказаў: "Такім чынам, згода, адзінагалосна!". Маўчанне. Дэлегацыя падпісвае трактат. У 3. 30 кароль зачыняе паседжанне. У выніку адбыўся другі падзел Рэчы Паспалітай [1].

Сіверс пісаў, што кароль быў занадта злы і пяшчоты прагны, каб, нягледзячы на любыя жадання, пагражаць не стаць на калені [10].

Уладзіслаў Рэймант у сваей кнізе «Апошні сейм Рэчы Паспалітай» выдатна апісаў стан караля падчас сейма: «І Станіслаў-Аўгуст займаў сваё месца на троннай крэсле, працягваючы прысутнічаць пры разлютаваных спрэчках. Ён сядзеў дакладна прыкаваны да ганебнага слупа, выстаўлены пад град пякучых папрокаў апазіцыянераў, іх пагардай поглядаў і злаславых усмешак, - сядзеў, разумеючы жахлівае значэнне гэтага дня, пакутуючы ад несчасця, і першым схіляў галаву, падстаўляючы шыю пад ярмо, пад слабасцю, няздатны ні на барацьбу, ні на супраціў, ні на жыццё, ні на смерць. Самога ж яго глыбока хвалявала толькі адно пытанне: ці аплацяць, ва ўзнагароду за яго пакорлівасць, дзяржавы, разабраўшыя па частках яго краіну, яго даўгі і забяспечаць яму магчымасць спакойна пражыць астатак гадоў?» [3]. У апошнія дні сейма Панятоўскаму нічога іншага і не заставалася.

З кнігі В. І. Вадавозава «Очерки из русской истории XVIII в. » (1904 г. ) : “Но ему пришлось вынести много унижений. Потоцкий обходился с ним заносчиво, делал ему нотации, как школьнику, за былую преданность патриотам. От него требовали, чтобы он осудил как предателей бывших друзей своих. Король плакал, доходя почти до безумия. Несчастный король не знал, кого держаться, и склонялся то к одной, то к другой партии» [4].

У другі перыяд працы сейма акрамя галоўнага пытання вырашаліся і іншыя. У гэты самы перыяд адбылася большая частка баляў, якія суправаждалі працу сейма. Днём гаварылі пра любоў да Айчыны, а вечарам за грошы з расійскай і прускай казны ладзілі застолле, адзначалі імяніны Сіверса і караля. Пасля 25 верасня пачаўся апошні перыяд працы Гродзенскага сейма, калі галоўнымі пытаннямі былі заключэнне саюзнага трактату з Расіяй і прыняцце новай канстытуцыі. Праект дамовы Рэчы Паспалітай з Расіяй аб саюзе і сяброўстве паступіў на паседжанне сейма 14 кастрычніка. За заключэнне саюзнага трактату Станіслаў Аўгуст Панятоўскі ўзнагародзіў Сіверса і графа В. Зубава лентай Белага Арла [1].

4 (15) октября русско-польский союзный договор был "единодушно одобрен" сеймом. Русско-польский союзный договор 1793 года фактически нераздельно утверждал влияние России в Польше. На следующий день, 5 октября, Станислав Август направил послание Екатерине [5].

В рескрипте Сиверсу от 18 октября Екатерина сообщила, что уже приняла решение вывести значительную часть русских войск из Польши. Вместе с тем она поручила послу "внушить деликатным образом королю, что недостаточно только подписывать договоры, необходимо их верно и пунктуально выполнять” [5].

Гарадзенскі сейм скончыўся, усе разыходзіліся панурыя і смутныя. Станіслаў пастарэў і збляднеў. 17 лістапада ен з Сіверсам выехаў ў Варшаву [2].

Такім чынам, зыходзячы з аналізу паводзін караля Рэчы Паспалітай на сейме 1793 года можна зрабіць выснову аб тым, што кароль разумеў сапраўднае становішча спраў, мэты Прусіі і Расійскай Імперый і рабіў усе магчымае, каб спыніць падзел. Падчас пачатку сейма Панятоўскі яра адстойваў сваю пазіцыю па захаванні цэласнасці Рэчы Паспалітай і недапушчэнню падзела. Але пад канец сейма было зразумела: падзела

ПолесГУ

краіны не пазбегнуць, што аказалася балючым ударам для Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

У любым выпадку ен паказаў сябе прадбачлівым палітыкам, мэтанакіраваным чалавекам і сапраўдным каралем, які змагаўся да апошняга. Ягоную дзейнасць трэба разглядаць не ізалявана, а ў супярэчнасцях палітычных працэсаў як у Еўропе, так і ўнутры сваей краіны ва ўмовах пастаянных агрэсіўных дзеянняў іншых дзяржаў.

Між іншым, трэба аддаць належнае Станіславу Аўгусту Панятоўскаму як асветніку, мецэнату, культурнаму дзеячу і рэфарматару палітычнай і эканамічнай сістэм Рэчы Паспалітай, якія да яго ўзыходжання на трон знаходзіліся ў заняпадзе [8].


1. Горадня, П. Аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 - канец 18 ст. ). – Гродна : Пергамент, 1997. – 140 с.
2. Иловайский Д. И. Гродненский сейм 1793 года. Последний сейм речи посполитой. – Мінск, Беларусь, 2015. – 538 с.
3. Рэймант, У. Апошні сейм РэчыПаспалітай. – Мінск, Беларусь, 1994. – 248 с.
4. Вадавозаў, В. І. «Очерки из русской истории XVIII в.». – Санкт-Пецярбург : Расійская дзяржаўная бібліятэка. 1904 г. – 4, IV, II, 548 с.
5. Я. Е. СИВЕРС И ГРОДНЕНСКИЙ СЕЙМ [Электроннырэсурс]. – Рэжым доступу: http://www. vostlit. info/Texts/Dokumenty/Polen/XVIII/1760-1780/Stegniy/framepred36. htm. -Дата доступу: 25.04.2017.
6. История падения Польши. Глава 9 [Электроннырэсурс]. – Рэжым доступу: http://solovyev. lit-info. ru/solovyev/istoriya-padeniya-polshi/glava-xi. htm. – Дата доступу: 25.04.2017.
7. Полное собрание законов Российской империи. Том 23. 17. 141. Трактат, заключенный в Гродне между Ея Величеством Императрицею Всероссийскою и Его Величеством Королем и Яснейшей Речью Посполитой [Электронныръсурс]. – Рэжым доступу: http://www. nlr. ru/e-res/law_r/search. php. – Дата доступу: 25.04.2017.
8. Несцярчук, Л. М. «СтаніслаўАўгуст Панятоўскі. Манарх, асветнік, мецэнат». Брэст. Брэсцкая друкарня, 2011. – 298 с.
9. Анішчанка Я. Апошні сейм Рэчы Паспалітай: Дыярыуш Гродзенскага сейма 1793 года, прысутным сведкам Людвікам Гінетам падчас сесій пісаны // Архівы і справаводства. 1999. – № 2–6.
10. Польская вікіпедыя [Электронныръсурс]. – Рэжым доступу: https://pl. wikipedia. org/wiki/Stanisław_August_Poniatowski. – Дата доступу: 25.04.2017.
11. ИНСТРУКЦИЯ Я. Е. СИВЕРСУ ОТ 22 ДЕКАБРЯ 1792 ГОДА [Электронныръсурс]. – Рэжым доступу: http://www. vostlit. info/Texts/Dokumenty/Polen/XVIII/1760-1780/Stegniy/21-40/23. phtml?id=10891. – Дата доступу: 25.04.2017.
12. Я. Е. СИВЕРС И ГРОДНЕНСКИЙ СЕЙМ [Электронныръсурс]. – Рэжым доступу: http://www. vostlit. info/Texts/Dokumenty/Polen/XVIII/1760-1780/Stegniy/pred36. phtml. – Дата доступу: 25.04.2017.
13. Sejm Grodzienski 1793. Wydał, wstępemiprzypisamiopatrzył Henryk Olszewski [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www. bkpan. poznan. pl/biblioteka/ELITY/SEJM1793/p1. htm. – Дата доступу: 25.04.2017.
14. АВПРИ, Ф. "Сношения России с Польшей". Д. 1398. Л. 160 – 160 об.


Полесгу